У цэнтральнай раённай бібліятэцы створаны электронныя краязнаўчыя базы даных па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны на Кобрыншчыне.

Алічбаваная гісторыя вайны

Цэнтральная бібліятэка шмат гадоў працуе па зборы дакументаў, назапашванню інфармацыі і распаўсюджванню сярод чытачоў матэрыялаў па гісторыі Кобрынскага раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

У мінулым годзе да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў была створана паўнатэкставая база даных “Ха тыні вогненныя сёстры: трагедыя спаленых вёсак Кобрыншчыны”, якая налічвае на сённяшні дзень звыш
90 алічбаваных артыкулаў
.

Электронная паўнатэкставая база даных “Залатая зорка Кобрына: У.М. Кірмановіч, Герай Савецкага Саюза" таксама была створана летась. Уладзімір Мікалаевіч Кірмановіч для Кобрына назаўжды застанецца Ганаровым грамадзянінам і адзіным мясцовым Героем Савецкага Саюза.

У межах святкавання 70-годдзя Вялікай Перамогі праведзена работа па фарміраванню базы даных ”Кобрынскі край у гады Вялікай Айчыннай вайны”. Гэта самая аб’ёмная з існуючых БД цэнтральнай бібліятэкі. Алічбавана каля 350 артыкулаў перыёдыкі, раздзелаў кніг, раздзелаў кнігі “Памяць:гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна, мемуараў, успамінаў, ваенных хронік. Асноўныя раздзелы: край у пачатку Вялікай

Айчыннай вайн, акупацыйны рэжым, падпольны і партызанскі рух; вызваленне ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, нашы землякі на франтах Вялікай Айчыннай, помнікі Вялікай Айчыннай вайны на Кобрыншчыне і інш.

Мова галоўнай старонкі, частак і падраздзелаў - беларуская. Тэксты прыводзяцца на арыгінальных мовах. Бібліяграфічныя звесткі аб крыніцах у выпадку неінфарматыўнасці назвы дапоўнены анатацыямі, што дазваляе карыстальніку арынтавацца ў мностве прапануемых матэрыялаў і выбіраць неабходныя дакументы.

Практыка выкарыстання паказала, што з цікавасцю гэтым рэсурсам карыстаюцца школьнікі і студэнты, настаўнікі школ, каледжаў і краязнаўцы.

Трэба адзначыць, што БД - гэта рэсурс, які ўвесь час падтрымліваецца ў актуальным стане, своечасова дапаўняецца новымі дакументамі.

Задача бібліятэкі не толькі збіраць і захоўваць дакументы пра Кобрыншчыну, але і зрабіць іх даступнымі для наведвальнікаў.

Святлана Курачук,

галоўны бібліёграф

Кобрынскай

цэнтральнай раённай

 бібліятэкі